# ***Гісторыка-культурная спадчына Ваўкавышчыны.***

На тэрыторыі Ваўкавыскага раёна знаходзіцца 37 аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. З іх 14 помнікаў архітэктуры, 14 – археалогіі, 7 помнікаў гісторыі і 2 аб’екта нематэрыяльнай спадчыны.

Сярод найбольш значных, якія можна лічыць брэндавымі аб'ектамі Ваўкавыскага раёна, можна адзначыць такія помнікі гісторыка-культурнай спадчыны як: касцёл Святога Вацлава ў горадзе Ваўкавыску; Дом былой сядзібы «Дом Баграціёна»; былыя сядзібы ў вёсцы Краскі і аграгарадку Падароск; гарадзішча ранняга сярэднявечча (Шведская гара, Замчышча, Муравельнік) у горадзе Ваўкавыску; паселішчы, стаянкі, крэмнездабыўныя шахты, майстэрні перыяду каменнага, бронзавага і ранняга жалезнага вякоў ў гарадскім пасёлку Краснасельскі.

## ***Помнікі архітэктуры***



**Касцёл св. Вацлава з агароджай і брамай (1846 – 1848 гг.), г. Ваўкавыск, (кат. “3”)**

Мануметальны мураваны храм узведзены ў 1846 - 48 гг. Фундатарам будаўніцтва касцёла быў мясцовы пробашч Ян Ленікоўскі. Сродкі на

будаўніцтва ахвяравалі і мясцовыя парафіяне. Асвечаны касцёл быў біскупам віленскім Вацлавам Жылінскім.

Тэрыторыя касцёла абнесена агароджай з бутавага каменю і металічнай рашоткі. Галоўны ўваход вылучаны трохпралётнай мураванай аркай.

Помнік архітэктуры позняга класіцызму з элементамі эклектыкі.

Імкненне дойлідаў да спрошчанасці прасторавых архітэктурных кампазіцый адчуваецца ў прамавугольнай форме храма, аб'ём якога ярусна нарастае ад бакавых да цэнтральнага нефа пад нізкім 2-схільным дахам. Над галоўным заходнім фасадам узвышаюцца дзве 4-гранныя вежы, завершаныя купалкамі на высокіх цыліндрычных барабанах. Па восі прамавугольнага ўваходняга партала над магутным антаблементам дарычнага ордэра пастаўлены маштабна невялікі фігурны атык. Фасады маюць прынцыпова адметную трактоўку: на франтальным – складаны рытм прамавугольных праёмаў, на бакавых – дакладны рытм арачных аконных праёмаў у аркатурна-пілястравым абрамленні.

Унутраную прастору храма 2 рады калон (па 3 у кожным) падзяляюць на 3 нефы пад простым бэлечным перакрыццем. У глыбіні прамавугольная апсіда, якая раскрываецца ў цэнтральны неф арачным прасветам і асветлены вітражамі 2 люкарнаў. Алтар вырашаны стукавай каланадай са ступеньчатым атыкам, які акаймляюць вялізны алтарны абраз "Узнясенне" і скульптуры святых Пятра і Паўла (XIX ст.). Два бакавыя алтары паводле кампазіцыйнага і дэкаратыўнага вырашэння ідэнтычныя цэнтральнаму, аздоблены вітражамі. Над нартэксам размешчаны хоры. Абразы XVIII ст. "Нараджэнне Хрыста" і "Св. Казімір"

**Касцёл Яна Хрысціцеля. Галоўны і бакавы алтары касцёла(XVII – XVIII ст.), в. Воўпа, (кат. "2")**







Бакавы алтар касцёла Галоўны алтар касцёла

Першы храм у вёсцы быў пабудаваны Ў 1478 г. па фундацыі Аляксандра Гальшанскага і яго жонкі Ядвігі. Драўляны храм часта гарэў, у 1753 г. на яго месцы быў збудаваны новы касцёл. І ўжо ў 1773 годзе біскупам інфлянцкім Янам Напамуком Касакоўскім быў пабудаваны дзейнічаючы да сёння драўляны касцёл, які ў к.19 ст. рэстаўраваўся. Вялікую каштоўнасць касцёла складае галоўны алтар 1-ай пал. 17 ст., які быў перанесены з ранейшага касцёла. Алтар выкананы ў стылі маньерызму і ранняга барока. Фундатарам алтара быў падканцлер Вялікага князя Літоўскага – Казімір Леон Сапега.

**Касцёл св.Міхаіла Архангела (1524, 1840, 1930 гг.), в.Гнезна, (кат. “2”)**



Касцел св. Міхаіла Архангела быў пабудаваны ў 1527 г. на сродкі ўладальнікаў Гнезна Шамятовічаў. З 2-ой паловы XVI ст. да 1643 г. касцёл быў пратэстанскім саборам. Пасля адбыўшыхся ў сацыяльна-палітычным жыцці дзяржавы змен, ён зноў быў вернуты рымска-каталіцкай царкве. Рамантаваўся ў 1840 годзе Іеранімам Тарасевічам. Новая рэстаўрацыя паводле праекта Тадэвуша Пмацынскага адбылася ў 1930 – 1932 гг.

**Касцёл Яна Хрысціцеля. Дэкаратыўнае аздабленне інтэр’ера: бакавы алтар, хрысцільня ў правым нефе (XVIII ст.), в.Мсцібава, (кат. “2”)**



Касцёл Яна Хрысціцеля.



Галоўны алтар.



Бакавы алтар.



Хрысцільня ў правым нефе.

Пабудаваны з чырвонай цэглы ў цэнтры вёскі. Помнік архітэктуры неаготыкі і неараманскага стылю.

Уяўляе сабой двухвежавы храм базілікальнага тыпу з трансептам, трохграннай апсідай і дзвюма сакрысціямі. Галоўны заходні фасад трохчасткавы: па цэнтры прарэзаны вялікай высокай стральчатай нішай і завершаны двухслойным спічастым шчытом, па баках уздымаюцца высокія

двух’ярусныя вежы з фігурнымі шатрамі-ківорыямі. У кожнай частцы – уваходны арачны праём, над цэнтральным – акно-трыфорыум. Бакавыя фасады расчлянёны лучковымі праёмамі ў два ярусы, у прасценках спічастыя контрфорсы. Імі ўмацаваны вуглы вежаў, трансепта і апсіды.

У інтэр’еры нефы перакрыты цыліндрычнымі нервюрна-зоркавымі скляпеннямі. У паўночным крыле трансепта – драўляны двух’ярусны разны алтар Св. Яна (XIX ст.), вырашаны карынфскай каланадай і дэкарыраваны ажурнай разьбой. На хорах арган. Абразы XVIII ст. «Айчына» (прывезены з касцёла в. Шылавічы Ваўкавыскага раёна), «Ян Хрысціцель», «Маці Божая Ружанцавая».

Перад храмам стаіць званіца з жоўтай цэглы, выкананая ў выглядзе трыумфальнай аркі з падвешаным над ёй звонам.

**Касцёл св. Тройцы (пачатак XIX стагоддзя), г.п.Рось, (кат. “2”)**





Запіс аб пачатку будаўніцтва храма адносіцца да 1740 г. Па невядомых прычынах будаўніцтва было спынена на некалькі дзесяткаў гадоў. У 1766 г. будаўнічыя работы аднавіліся і з перапынкамі працягваліся да 1796 г. За гэты перыяд былі ўзведзены сцены касцёла да ўзроўню акон. Завершана будаўніцтва касцёла ў 1801 г. пры ўладальніку Росі Ф. Патоцкім. Асвячоны храм 12 ліпеня 1808 г.

У 1852 г. пад час рамонту адбыўся пажар, які знішчыў дах касцёла. На сродкі графіні Зоф’і Пац у тым жа годзе дах быў адноўлены.

У 1901–1903 гг. праведзены капітальны рамонт інтэр’ераў касцёла.

Касцёл у Росі з’яўляецца санктуарыумам Цудатворнай фігуры Ісуса Міласэрнага.

Храм – прамавугольны ў плане будынак з нязначна выступаючым трансептам і паўцыркульнай апсідай. Галоўны паўднёвы фасад завершаны трыгліфным фрызам з развітым карнізам, над якім атыкавы франтон з паўкруглым аконным праёмам у тымпане. Бакавыя фасады дэкарыраваны

рустоўкай і завершаны прафіляваным карнізам. Інтэр’ер зальны, перакрыцце – драўляныя цыліндрычныя скляпенні. Уздоўж бакавых сцен праходзіць галерэя з драўлянай агароджай. Сцены завершаны масіўным карнізам з сухарыкамі.

У інтэр’еры над уваходам – хоры на чатырох круглых калонках. На сценах, скляпеннях асноўнага аб’ёму і алтарнай часткі размешчаны жывапісныя кампазіцыі на біблейскія тэмы і дэкаратыўна-архітэктурны роспіс, які стварае ілюзорнае ўяўленне прасторы. Драўляны разны алтар двух’ярусны, расчлянёны калонамі карынфскага ордэра, дэкарыраваны накладной пазалочанай разьбой і скульптурай.

На паўднёвы ўсход ад касцёла асобна пастаўлена ў 1908 г. двух’ярусная мураваная званіца.

**Касцёл св.Пятра і Паўла (1778 г.), в.Ізабелін, (кат. “3”)**



Адкрыты і асвячоны гродзенскім біскупам А.В.Кашкевічам у 1992 годзе. Касцёл Святых Пятра і Паўла (архіт.). На паўночнай ускраіне вёскі. Пабудаваны графам Грабоўскім у 1778 г. з цэглы. (Спачатку гэта быў кальвінскі збор). Будынак прамавугольны ў плане, у паўночна-заходняй частцы — паўцыркульная апсіда. Галоўны (паўднёва-ўсходні) фасад аднавежавы, расчлянёны 4 пілястрамі і завершаны антаблементам з развітым карнізам. Васьмігранная вежа-званіца ўзвышаецца над трапецападобным франтонам (завяршэнне вежы не захавалася). Плоскасці сцен бакавых фасадаў расчлянёны пілястрамі і лучковымі аконнымі праёмамі. Інтэр'ер зальны, мае плоскае драўлянае перакрыцце. Пры ўваходзе — 2 масіўныя калоны, якія падтрымліваюць хоры. Перад калонамі знаходзіцца невялікі тамбур, перакрыты цыліндрычным скляпеннем з

распалубкамі. Абапал тамбура размешчаны службовыя памяшканні. Дэкаратыўнае ўбранства інтэр'ера не захавалася.

Храм — помнік архітэктуры пераходнага перыяду ад барока да класіцызму.

**Свята-Троіцкая царква (1776 г.), в. Падароск, (кат. “3”)**







Першая згадка пра царкву ў Падароску адносіцца да 1630г. Уладальніца Падароску Марына Клочкаўна, княгіня Пракопава Дольская, дае праваслаўнай царкве фундуш - 9 1\2 валок зямлі і даручае «апеку» гэтага фундушу Віленскаму Свята-Духава манастыру.

Царква была пабудавана драўляная.

Сын Марыны Клочкаўны Падароскай і Пракопа Дольскага, Павел перадаў землі царквы ўніятам. Зразумела, царква таксама перайшла да уніятаў. Пасля скасавання уніі царква зноў пераданая праваслаўным. Праваслаўная царква функцыянавала ў Падароску да 1925 г. У 1925 храм быў перададзены каталікам. Адбылося гэта ў другой палове 1925 г. -у гэты ж час там быў зроблены невялікі рамонт. Касцёл быў таксама названы ў гонар Св. Эльжбэты. Перабудова касцёла доўжылася да 1939 г., але так і не была скончаная. У верасні 1939 г. касцёл быў зачынены і стаяў у занядбаньні. У 1990 г. будынак храма был вернуты праваслаўным жыхарам Падароску . За адзін год быў зроблены рамонт храма і ўвосень 1991 г. адбылося асвячэнне храма ў гонар Святой Тройцы. На левым фота, зробленым ў 70-

80 г. XX стагоддзя, бачна, што раней званіца была значна вышэй. Да таго ж, праваслаўныя прыбудавалі цыбуліну на наверша храма, які раней меў класічны гатычны дах.

**Свята-Мікалаеўская царква (1874 г.), г. Ваўкавыск, (кат. “3”)**




Пабудаваны храм ў 1874 годзе і асвечаны 19 студзеня 1875 года ў імя Свяціцеля Мікалая. Храм каменны. Пры польскай уладзе ў 1919 -20 гг. Свята-Мікалаеўскі храм быў ператвораны ў гарнізонную каталіцкую парафію, а вернуты праваслаўным толькі пасля таго, як згарэў Петра-Паўлаўскі парафіяльны храм, які быў пабудаваны ў 1867 г.

**Свята-Міхайлаўская царква (канец XVIII ст., 1863, 1924 г.), в. Ізабелін, (кат. “3”)**




Храм пабудовы канца XVIII стагоддзя. Матэрыял сцен - чырвоная цэгла, у плане прастакутнік, маюцца элементы барока. Перабудоўваўся ў 1863 і 1924 гадах. Маюцца абразы і начынне 18 і 19 стагоддзяў.

18 красавіка 1863 гады пасля ўдару маланкі ў званіцу, загарэлася і згарэла драўляная вежа, расплавіліся званы, і агонь ахапіў увесь будынак. Згарэў дах і драўляныя перакрыцці, столь і іканастас. Царкоўныя рэчы была выратавана дзякуючы самаадданым дзеянням вернікаў.

Аднаўленне храма заняло некалькі месяцаў. І ўжо 8 лістапада 1863 года царква была асвечана ў імя Святога Міхала Архангела Ваўкавыскім благачынным пры службе 10 святароў і 1 дыякана, пры саборы народу каля 4000 чалавек. Да дня асвячэння ад царскай сям'і былі дасланыя богаслужбовыя кнігі і поўнае святарскае адзенне.

**Дом былой сядзібы ("дом Баграціёна") (1805 г.) г.Ваўкавыск, вул.Баграціёна, 10 (кат. "2")**



Будынак музея быў узведзены ў 1808 годзе і раней быў панскім маёнткам. У 1812 годзе ў ім знаходзілася штаб-кватэра 2-ой Заходняй арміі Расіі, якой камандаваў Пётр Іванавіч Баграціён. У другой палове чэрвеня 1812 года армія адступіла на ўсход, былое памяшканне штаба было часткова разбурана. Пасля вайны будынак быў адноўлены, ў ім знаходзілася гарадская бальніца, потым – прытулак для састарэлых.

У 1949 г. у будынку былі размешчаны экспанаты Ваўкавыскага краязнаўчага музея, якім кіраваў Георгій Іосіфавіч Пех. У 1950 годзе перад будынкам быў устаноўлены бюст П.І.Баграціёна, выкананы беларускім скульптарам З.І.Азгурам у 1047 годзе.

Загадам камітэта па справах культурна-асветных устаноў пры Савеце міністраў БССР у 1953 годзе Ваўкавыскі раённы краязнаўчы музейператвораны ў ваенна-гістарычны з прысваеннем імя П.І.Баграціёна. У 2001 г. да памяшкання была зроблена прыбудоўка.

На сёняшні дзень у экспазіцыйных залах старога памяшкання музею размешчана экспазіцыя, прысвечаная вайне 1812 года.

**Былая сядзіба: сядзібны дом, гаспадарчыя пабудовы, фрагменты агароджы (пачатак XIX стагоддзя), в.Падароск, (кат. "2")**



Сядзіба сфарміравана ў сярэдзіне 19 ст. Уключае мураваны дом, некалькі мураваных і драўляных гаспадарчых пабудоў. Тэрыторыя абкружана мураванай агароджай (захавалася часткова) з 2 уездамі — з боку шашы (аформлены манументальнай брамай) і з паўночнага боку па цэнтральнай восі дома.

Сядзібны дом. Аднапавярховы прамавугольны ў плане з невялікай драўлянай прыбудовай з боку дваровага фасада. Цэнтральная частка галоўнага фасада з мансардай вылучана чатырохкалонным порцікам, які завяршаецца трохвугольным франтонам, акаймаваным прафіляваным карнізам з сухарыкамі. Будынак накрыты двухсхільным дахам з паўвальмамі па тарцах. З боку дваровага фасада сіметрычна цэнтральнаму порціку знаходзіцца шырокая тэраса. Па цэнтральнай восі галоўнага ўвахода размешчаны вестыбюль з лесвіцай на мансарду. Жылыя памяшканні анфіладнай планіроўкі (цяпер планіроўка часткова зменена).

Уладальнікам каштоўнасці праводзіцца работа па кансервацыі аб'екта і распрацоўцы канцэпцыі турыстычнага цэнтра «маёнтак Падароск».

**Былая сядзіба: сядзібны дом, парк (XIX – пачатак XX ст.), в.Краскі, (кат. “2”)**






Сядзібна-паркавыс комплекс (у Дзяржаўным спісе – Былая сядзіба: сядзібны дом, парк) сфарміраваны ў XIX – пачатку XX ст. Уключае сядзібны дом, гаспадарчыя пабудовы, парк, сажалку. Займае тэрыторыю - 7,3423 га, дзе размешчаны асноўныя жылыя і гаспадарчыя пабудовы, вакол іх пейзажны парк.

Пісьмовыя крыніцы ўтрымліваюць даволі скупыя звесткі аб сядзібе і яе ўладальніках. У к.18 ст. згадваецца фальварак Краскі, які належаў Яну Сухадольскаму. У 1830 ыя гг. існавала вёска Краскі, у якой налічвалася 11 двароў. Вёска належала сям’і Булгарыных. У сяр. 19 ст. Краскі перайшлі ў валоданне да Сегеняў.

Сядзібны дом сфарміраваны ў некалькі этапаў і складаецца з больш ранняй драўлянай часткі і прыбудаванага пазней двухпавярховага мураванага аб’ёма. Паводле бібліяграфічных крыніц, драўляны сядзібны дом пабудаваны ў 1839 г., найбольш верагодна, яшчэ Булгарынымі. Узвядзенне мураванага аб’ёма даследчыкі датуюць 1905 г. Гэта дата засведчана на флюгеры вежы.

З паўднёвага боку ад сядзібнага дома знаходзяцца жылы флігель і службовыя будынкі, пабудаваныя, верагодна, адначасова з мураваным домам у к.19-п.20 ст. Вялікі гаспадарчы комплекс размешчаны адасоблена

з паўднёва-заходняга тэрыторыі сядзібы. Будынкі змураваны з цэглы і каменю. На адным з іх на франтоне пазначаны 1895 г.

Вакол сядзібнага дома існуе парк пейзажнага тып, закладзены ў к.19 ст. Ад сядзібнага дома адкрываецца асноўная перспектыва на вадаём, які існаваў у пойме р.Зяльвянкі. Уздоўж парку ішла яловая алея. Цяпер парк значна зменены, зніклі сажалкі, зараслі дрэў і хмызняку закрылі перспектывы.

**Фрагменты сядзібна-паркавага комплексу (XIX ст.), в.Цеалін, (кат. "2")**



Палац ў Цеаліне - вялікую мураваную рэзідэнцыю з двума флігелямі па баках – пабудаваў у к.18 ст. Томаш Грабоўскі. На жаль, палац быў разбураны ў час першай сусветнай вайны. Але захаваныя флігелі – аданапавярховыя з рэзалітамі і трохвугольнымі франтонамі, упрыгожаннымі ляпнінай, - дазваляюць нам зрабіць выснову аб тым, што палац хутчэй за ўсё быў пабудаваны ў стылі класіцызму.

Парк пейзажнага тыпу з элементамі рэгулярнай планіроўкі плошчай каля 8 г, знаходзіца на левым беразе р. Рось. З поўначы і ўсходу абмежаваны 2 каналамі, якія запаўняюцца вадой р. Рось. Мае трохчасткавую кампазіцыю. Першая частка — на вяршыні ўзгорка, паміж 2 сіметрычна пастаўленымі сядзібнымі дамамі, уяўляе сабой партэр з кветнікамі, кустамі, адзіночнымі пасадкамі дрэў. Другая частка — на пакатых схілах узгорка. Тут на розных узроўнях праходзяць 3 паўкальцавыя алеі, аб'яднаныя лесвіцамі, якія вядуць да партэра. Трэцяя частка, размешчаная ў нізкай пойме ракі і абмежаваная каналамі, мае маляўнічую планіроўку з шырокімі палянамі і групамі дрэў. Пераважаюць лісцевыя пароды — клён, ліпа. Цэнтр кампазіцыі — галоўная алея, якая пачынаецца ад вяршыні ўзгорка, праходзіць перпендыкулярна паўкальцавым алеям праз усю паркавую тэрыторыю, аб'ядноўваючы 3 яе часткі.

Прыклад садова-паркавага мастацтва.

**Былы сядзібны дом (другая палова XIX ст.), в.Гнезна, (кат. “3”)**



Сядзібны дом пабудаваны ў 2-я палове 19 ст. Аднапавярховы мураваны прамавугольны ў плане будынак. 3 боку дваровага (заходняга) фасада мае паўпадвальны паверх. У цэнтры галоўнага фасада — мансарда з шырокім балконам на 4 масіўных слупах, якія ўтвараюць арачны порцік. 3 паўднёвага тарцовага фасада да дома далучаны невялікі пяцісценны алькеж. Унутраная планіроўка анфіладнага тыпу, часткова зменена. Аднапавярховыя мураваныя флігелі прамавугольныя ў плане, размешчаны абапал галоўнага фасада сядзібнага дома.

**<u>Помнікі археалогіі</u>**

**Гарадзішча перыяду ранняга сярэднявечча (Шведская гара), (X – XIII ст.) г.Ваўкавыск (кат. “3”)**



Вядома пад пазвай “Шведская Гара”. Знаходзіцца на паўднёва-ўсходняй ускраіне горада. Вышыня 28 - 32,5 м. Пляцоўка амаль круглай формы, памерам 55х50 м, абкружана магутным валам вышынёй да 7 м. З паўднёвага боку вала ёсць уезд. Даследавалі ў 1925 г. Ю. Ядкоўскі, у 1954 г. В. Р. Тарасенка, у 1965 - 66 гг. Я. Г. Звяруга. Ускрыта 540 $м^2$ плошчы. Культурны пласт ад 0,6 м у цэнтральнай частцы пляцоўкі да 3,5 м каля вала. Адкрыты паўзямлянкавыя і наземныя жытлы ў выглядзе рэштках драўляных зрубаў памерам 4х3,5 м з печамі-каменкамі. У культурным пласце знойдзены ганчарная кераміка, жалезныя шпоры, цёслы, разнастайныя наканечнікі стрэл, наканечнікі коп’яў, вырабы з косці і рогу, шкла і бурштыну, сельскагаспадарчыя прылады і інш. Адносіцца да 10 - пачатку 14 ст., дзядзінец старажытнарускага Ваўкавыска.

**Гарадзішча перыяду ранняга сярэднявечча (замчышча) (XI – XIII ст.), г.Ваўкавыск (кат. “3”)**



Знаходзіцца на захад ад гарадзішча Шведская Гара. Пляцоўка ў плане блізкая да трапецыі, прымыкае да гарадзішча. З боку поля ўмацавана валам вышынёй да 5 м. Даследавалі ў 1925 г. Ю. Ядкоўскі, у 1948-58 гг. Г. І. Пех, у 1954-56 гг. В. Р. Тарасенка, у 1959 г. П. А. Рапапорт, у 1965, 1967 гг. Я. Г. Звяруга, у 1966 г. М. К. Каргер. Раскапана 2196 $м^2$. Культурны пласт 0,3—2,1 м. Выяўлены рэшткі падмурка старажытнай царквы, жытлаў паўзямлянкавага тыпу з печамі-каменкамі ў вуглу. Знойдзены вырабы з жалеза (рэчы з рыштунку вершніка і каня, нажы, рэшткі замкоў, ключы, рыбалоўныя кручкі і сякеры, ножніцы), вырабы з рогу і косці, шкла і бурштыну, каляровых металаў, арабскі дырхем. Адносіцца да канца 10—14 ст., з'яўляецца вакольным горадам старажытнага Ваўкавыска.

**Гарадзішча перыяду ранняга сярэднявечча (X – XI ст.), г.Ваўкавыск, на паўднёва-ўсходняй ускраіне горада (кат. “3”)**



Вядома пад пазвай “Муравельнік”. Знаходзіцца на паўднёва-ўсходняй ускраіне горада, за 500 м на ўсход ад гарадзішча “Шведская гара” у нізінным забалочаным месцы. Пляцоўка авальная, памерам 120х60 м, умацавана валам вышынёй да 3 м, у паўднёва заходняй частцы вала знаходзіцца ўезд. Даследавалі ў 1959 г. П.А.Рапапорт, у 1965 - 71 гг. Я. Г. Зваруга. Ускрыта 1024 $м^2$ плошчы. Культурны пласт ад 0,3 м у цэнтральнай частцы пляцоўкі да 2 м каля вала. Адкрыты паўзямлянкавыя жытлы ў выглядзе рэшткаў драўляных зрубаў з печамі-каменкамі. У культурным пласце знойдзены наканечнікі коп’яў і стрэл, шпоры, спражкі, ключы, бронзавыя ўпрыгожванні, ганчарная кераміка, вырабы з косці і рогу. Некаторыя знаходкі маюць скандынаўскія аналагі. Адносіцца да 10 - 11 ст.

**Паселішчы, стаянкі, крэмнездабыўныя шахты, майстэрні перыяду каменнага, бронзавага і ранняга жалезнага вякоў (3–1-е тысяча-годдзі да н.э.), г.п.Краснасельскі, на паўднёвы захад ад пасёлка (кат. “3”)**



Закансерваваныя крэмнездабываючыя шахты



Стаянка эпохі неаліту і бронзавага часу

Археалагічны комплекс каля г.п. Краснасельскі складаецца з 8 аб’ектаў: паселішчы, стаянкі,кремнездабыўныя шахты, майстэрні каменнага, бронзавага і ранняга жалезнага часу.

I – кремнездабываючыя шахты эпохі неаліту і бронзавага часу (3-1 тыс. да н.э.), 0,5 км на ПД-З ад пасёлка на левым беразе р. Рось. На усходнім канцы лінзы адорвення № 3 захавалася больш за 80 не даследаванных шахтаў.

II – кремнеапрацоўчая майстэрня бронзавага часу (3-2 тыс. да н.э.), за 1 км на ПД ад пасёлка, на левым беразе р. Рось, ва ўрочышчы Тры Сасны, з правага боку шашы Ваўкавыск-Краснасельскі.

III – могільнік культуры шарападобных амфар (2 тыс. да н.э.), за 1,5 км на ПД-З ад пасёлка, на заходнім краі крэйдавай лінзы № 2а.

IV – селішча культуры штрыхаванай керамікі і зарубінецкай культуры (I ст. н.э.), на выступе 2-й надпойменнай тэрасы правага берага р. Рось, на захад ад мелавой лінзы "Рэйста", плошча каля 200 м.

V – стаянка 4 эпохі неаліту і бронзавага часу (3-2 тыс. да н.э.) і селішча зарубінецкай культуры (1-2 ст. н.э.), за 500 м на ПД ад пасёлка на левым беразе ракі Рось, каля ўрочышча Піскаўшчызна, плошча каля 1 га.

VI – стаянка 5, эпохі неаліту і бронзавага часу (3-2 тыс. да н.э.), на выступе 2-й надпойменнай тэрасы правага берага р. Рось, на захад ад мелавой лінзы "Рэйста", плошча каля 1 га.

VII – стаянка 6 арэнсбургскай культуры фінальнага палеаліту (12-10 тыс. да н.э.), за 500 м на ПД-З ад пасёлка, на правым беразе р. Рось, ва ўрочышчы Сосны, плошча каля 500 кв.м.

VIII – стаянка 7 эпохі неаліту і бронзавага часу (3-2- тыс. да н.э.), на астанцы 2-й надпойменнай тэрасы  на правым беразе р. Рось, на Ус ад чыгуначнай лініі Мачульна-Рось, за 150 м ад кіламетровага слупа 886, памерамі 220х105 м.

**Селішча (IV – V, XII – XIII стагоддзі) в.Глядневічы (кат. "3")**

**Каменны могільнік эпохі сярэднявечча (XV – XVII стагоддзі) в.Дыхнавічы, на паўднёвы захад ад вёскі (кат. "3")**

**Курган перыяду ранняга сярэднявечча (X – XII стагоддзі) в.Лазы, 1,8 на паўднёвы захад ад вёскі (кат. "3")**

**Каменны могільнік перыяду сярэднявечча (XIV – XVI стагоддзі) в.Лазы, 0,7 км на поўнач ад вёскі (кат. "3")**

**Каменны могільнік перыяду сярэднявечча (XV – XVII стагоддзі) в.Мачуліна, 1 км на паўднёвы захад ад вёскі (кат. "3")**

**Каменны могільнік перыяду сярэднявечча (XIV – XVI стагоддзі) в.Мінеўшчына, 0,15 км на поўнач ад вёскі (кат. "3")**

**Гарадзішча перыяду сярэднявечча (XII – XIII, XVI – XVIII стагоддзі) в.Мсцібава, 0,5 км на захад ад вёскі (кат. “3”)**

**Каменны могільнік перыяду сярэднявечча (XV – XVIII стагоддзі) в.Навасёлкі, 1 км на паўднёвы захад ад вёскі (кат. “3”)**

**Курганны могільнік перыяду ранняга сярэднявечча (XI – XII стагоддзі) в.Падрось, 1,5 км на паўднёвы захад ад вёскі (кат. “3”)**

**Селішча перыяду ранняга сярэднявечча (XI – XIV стагоддзі) в.Тупічаны, на паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі (кат. “3”)**

## ***<u>Помнікі гісторыі</u>***

**Брацкая магіла 1941 – 1944 гг. г.Ваўкавыск, вул.Жолудзева, у скверы (кат. “3”)**



«Воін з вянком»



Стэлы з мемарыяльнымі дошкамі

**Брацкая магіла 1941 – 1944 гг. г.Ваўкавыск, вул. Мядзведзева (кат. “3”)**



**Брацкая магіла 1941 год, в.Ізабелін (кат. “3”)**



**Брацкая магіла 1944 год, в.Ізабелін (кат. “3”)**



**Брацкая магіла 1941 – 1944 гады, в.Падароск (кат. “3”)**



**Брацкая магіла 1944 г, г.п.Рось (кат. “3”)**



Абеліск



Мемарыяльныя дошкі

**Брацкая магіла 1944 г, в.Шылавічы (кат. “3”)**



**Нематэрыяльныя праяўленні**
**творчасці са статусам гісторыка-культурнай каштоўнасці**
**Рэспублікі Беларусь**

***<u>Традыцыя простага двухнітовага ткацтва.</u>***
***<u>Ваўкавыскі раён</u>***









Простае двухнітовае ткацтва – гэта самае распаўсюджанае перапляценне, якое выступае ў якасці ўніверсальнага фону для дэкору, выкананага ў іншых ткацкіх тэхніках. У такой тэхніцы выраблялі тканіны на адзенне (палатно для кашуль, спадніц, фартухоў), ручнікі, посцілкі, ходнікі. Вырабы, выкананыя ў тэхніцы простага двухнітовага ткацтва, захоўваюцца і практычна ўжываюцца многімі вясковымі сем'ямі Ваўкавыскага раёна, але як рэгулярны занятак і хатняе рамяство простае двухнітовае ткацтва ўжо сустракаецца вельмі рэдка. Носьбіты традыцыі перадаюць сваё рамяство мясцовым школьнікам і моладзі на занятках у раённым Цэнтры рамёстваў у г.п. Рось.

Традыцыя двухнітовага ткацтва была характэрна для ўсёй Ваўкавышчыны, яна мае адметныя лакальныя варыяцыі, адлюстроўвае

характар мясцовай і рэгіянальнай культуры і  прызнаецца яе носьбітамі як элемент іх спадчыны.

У нашым раёне простае ткацтва адрозніваецца ад іншых пачынальна з навіўкі асновы, застаўся старажытны спосаб - на рухомай раме;сваёй каляровай гамай, ужывальнымі матэрыяламі, ткацкім станком – “варштатам”.

У вёсцы Студзянец займаецца простым ткацтвам Балёнь Любоў Сцяпанаўна, а таксама Кулеш Ганна Іосіфаўна, якая пражывае ў пасёлку Рось.

Гісторыя простага двухнітовага ткацтва менавіта ў Ваўкавыскім раёне мала даследавана, але не выклікае сумнення, што гэты від ткацтва -- самы старажытны, на Беларусі вядомы з 11-13 ст., калі ва ўжытак увайшоў гарызантальны ткацкі станок з нітамі і панажамі – кросны і пашырылася вышыўка.

Носьбіты вельмі станоўча адносяцца да таго факта, што элемент простага ткацтва будзе ўзяты пад ахову дзяржавы, бо менавіта гэты элемент з’яўляецца асновай усяго ткацтва, што само па сабе вялікая каштоўнасць народнага рамяства.

## ***<u>Веды і ўменні па вырабу традыцыйнага вясельнага каравая на Ваўкавышчыне</u>***





На Ваўкавышчыне па гэты дзень жывая традыцыя вырабу звычайнага вясельнага каравая. Комплекс уменняў па стварэнні важнага атрыбуту цырымоніі шлюбу характэрны для вёсак Мацвееўцы, Майсеевічы, Новая Ятвезь і г.п. Краснасельскі Ваўкавыскага раёна.

Носьбіты традыцыі Ваўкавышчыны пякуць сакральны хлеб па вызначанай рэцэптуры, карыстаюцца праверанай гадамі тэхналогіяй вырабу, тым не менш у кожнай з каравайніцы ёсць свае кулінарныя сакрэты, дзякуючы якім караваі адрозніваюцца адзін ад аднаго.

У якасці інгрэдыентаў для стварэння галоўнага сімвала шчаслівага жыцця маладой пары выкарыстоўваюцца натуральныя прадукты, склад хлеба беражліва захоўваецца, рэцэпт перадаецца з пакалення ў пакаленне. Ваўкавыскі вясельны каравай адрозніваецца высокай якасцю і традыцыйным упрыгожаннем у выглядзе шышачак, кветак і фігурак птушак. Звычайна каравайніцы пачынаюць выпякаць хлеб за суткі, а часам, калі каравай трэба ўпрыгожыць, за двое сутак да вяселля. Працэс вырабу доўгі і патрабуе ўважлівага прытрымлівання рэцэптуры.

Падрыхтоўка сакральнага хлеба суправаджаецца чытаннем спецыяльнай малітвы, паколькі каравай традыцыйна лічыцца Чароўным дарма. Пад гукі беларускай полькі праходзіць вынас вясельнага каравая. Упрыгожаны хлеб ставіцца перад маладымі. Каравай, які азначае даўгалецце і шчасце, дзеліцца паміж гасцямі ў момант уручэння пары падарункаў. Верх хлеба, як сімвал працягу роду, дабрабыту і добрай долі застаецца маладым.

Традыцыя падрыхтоўкі вясельнага каравая на Ваўкавышчыне - гэта своеасаблівы ідэнтыфікатар лакальнай культуры, самабытнага звычаю сямейнай або каляндарнай абраднасці.